Палявое дрэва

Аўтар: Анна Віткоўская
02.03.2012 01:00



Зіма падыходзіла да кан-ца. Цёплыя прамяні сон-ца ўсё часцей прабіваліся скрозь аблокі, і прырода патроху абуджалася ад сну. Напярэдадні вясны ўсе дзеці ў класе Валіка атрымалі заданні. Адны малявалі, іншыя сеялі насенне кветак, а Валіку даручылі напісаць сачыненне, тэма якога – вядомая прымаўка: “Чалавек нібы палявое дрэва”. “Дзіўна, – падумаў Валік. – Дрэва – гэта дрэва, а чалавек – гэта чалавек. Што паміж імі агульнага? Трэба пагаварыць з братам. Ён вучыцца ва ўніверсітэце і, напэўна, усё падрабязна мне растлумачыць”.

Валік дачакаўся канца ўрокаў і пабег дахаты.

Брат Валіка, Міхась, уважліва выслухаў пытанне, узяў аловак і намаляваў парастак. †



– На самым пачатку дрэва – гэта маленькі далікатны парастак, які вельмі жадае стаць вялікім. Гэтак жа і дзіця жадае вырасці і стаць дарослым, самастойным.

Міхась дамаляваў зямлю, дождж і сонца.

– Каб стаць вялікім, парастку патрэбны спрыяльныя ўмовы, – растлумачыў ён.

– Гэта ясна, – узрадаваўся Валік. – Без зямлі і сонца дрэва не вырасце. Але прычым тут чалавек?

Аўтар: Анна Віткоўская
02.03.2012 01:00

Падумаўшы трохі, Міхась адказаў:
– Чалавеку таксама патрэбны ўмовы для росту. Клапатлівая сям'я, верныя сябры і добры настаўнік, які дапаможа зразумець, што ў жыцці самае галоўнае.

Міхась зноў узяўся за аловак. Ён намаляваў прыгожае высокае дрэва з зялёнай кронай, а побач – садовыя нажніцы.
– Паглядзі, дрэву трэба абразаць сухія галінкі, каб усе яго сілы былі накіраваны толькі на рост. Чалавеку таксама трэба навучыцца берагчы сілы і не марнаваць іх на тое, што перашкаджае яму сталець.

Кожны год у жыцці дрэва настае асаблівы перыяд. Яно скідае лісце, каб набрацца сіл для цвіцення і паспявання пладоў. Хворае, завялае і сухое лісце дрэва скідае і цярпліва чакае вясны, каб эканоміць свае сілы і накіроўваць іх ва ўласны рост. Таксама і ў чалавека павінен быць асаблівы перыяд, каб дзякуючы пакаянню і малітве ачысціць сябе ад грахоў, скінуць непатрэбныя клопаты, напоўніцца духоўнымі сіламі і далей сталець на Божую хвалу і на радасць людзям.



Дрэва заўсёды расце ўгару, накіроўваючыся ўсё вышэй і вышэй – да неба і сонца. Толькі хворыя дрэвы растуць кронай уніз.

Таксама і намеры чалавека павінны быць высокімі, ён павінен накіроўвацца душой да Бога.
Дрэва прыносіць салодкія плады, якія мы так любім есці. А чалавек, калі сталее і становіцца самастойным, павінен прыносіць шмат карысці і радасці іншым.

Міхась намаляваў на дрэве чырвоныя яблыкі, такія прыгожыя, што Валік не ўтрымаўся і адкусіў кавалачак ад яблыка, якое ляжала на стале.
– Да чаго ж яно смачнае! – сказаў ён. – І я таксама змагу прынесці радасць людзям?
– Абавязкова.

Валік устаў з усмешкай на твары. Ён ужо ведаў, пра што будзе яго сачыненне.
А ў чым Вы, дарагія Сябры, падобны на дрэва?